ПРАЎДА

АДНАДНЁЎКА

Вільня, Чацьвер, 18-га сьнежня 1924 г.

Прамова міністра Тугутта.

На банкеце, які адбыўся 14-га сьнежня ў Вільні ў чэсьць прыехаўшага сюды віцэ-прэм'ера, п. Тугутта, апошні выступіў з доўгай праграмнай прамовай. Прамова гэта наказуе, у якім кірунку *хацеў-бы* павясьці польскую дзяржаўную палітыку былы галава „вызваленцаў".

Прамову гэтую можна разглядаць з двух пунктаў гледжаньня: ідэалягічнага і рэальнае палітыкі.

Ідэалёгія п. Тугутта вядома нам з часоў яго бытнасьці ў Сойме, дый — з праграмы „Вызваленьня". Водгукі яе бачым мы і ў віленскай прамове п. Тугутта.

Гэтак п. Тугутт прызнае прынцыпова патрэбу *аўтаноміі для „крэсаў"*, лічыць патрэбным—замест нацыянальнага ўціску — дабіцца *„шляхотнага супрацоўніцтва народаў" Польшчы*, „адсоўваньня тутэйшага насяленьня ад зямлі, на якой яно жыве і з якой зжылася,—*„праступленьнем"*, і г. д.

А на дзеле?

Перш за ўсё засьцерагаецца, што „сяголеньня *крэсам аўтаноміі не абяцуе*". Дык мо' хоць родную школу? І гэта не, бо — як п. Тугутт сказаў дэлегацыі Бел. Цэнтр. Шк. Рады—урад стаіць на становішчы *двуязычнае* школы. Дык мо' зямлю? Але-ж аб гэтым у плянах ураду і ў бюджэтах яго нямашака нічога: наадварот, ёсьць асыгноўкі толькі на асаднікаў.

Што-ж тады?

П. Тугутт ня зьбіраецца наагул рабіць „вялікіх рэчаў", а „хутчэй—дробныя, але затое бясспрэчныя", якія дагэтуль дражнілі польскае насяленьне. Але пры гэтым перш за ўсё п. Тугутт аглядаецца на... польскіх абшарнікаў, каб яны не палічылі і гэных драбніц—лішне вялікімі! І здаецца, што ў агульным падрахунку пасулаў п. віцэ-міністра нельга знайсьці нічога канкрэтнага — для беларусаў...

Затое, паводле заяваў п. Тугутта, урад маніцца цьвёрдай рукой узяцца за тутэйшую адміністрацыю, каб „карабіны паліцыі стралялі добра", калі будзе на тое патрэба. Бо—цяперашняя адміністрацыя яго не здаволівае, і ўрад ня пэвен свайго апарату, якім павінен карыстацца. Гэта і не дае яму магчымасьці наважыцца завясьці афіцыяльна выняткові стан на „Крэсах", бо такі „лек" можа аказацца ня лекам, а *атрутай*. Усё-ж такі „бясьпечнасьць" на „Крэсах" умацоўваецца аружнай рукой войска — усё тэй-жа адміністрацыяй, і на нашым пагранічч ў распараджэньні яе ў самым хуткім часе „знойдуцца сілы, у чатыры разы вялікшыя, чым былі раней".

Многа пекных *ідэй* высказаў п. Тугутт, але тое, што абяцуе *рабіць*, здаецца, нічога супольнага з гэтымі ідэямі ня мае. І не здарма віцэ-прэм'ер здалеў здаволіць сваей прамовай перш за ўсё... тутэйшых польскіх абшарнікаў, аб чым з трыумфам абвяшчае абшарніцкае „Słowo".

Дагэтуль урад, гаворачы аб санацыі „Крэсаў", паўтараў толькі адну — першую палову сталыпінскае формулы: перш успакаеньне, пасьля рэформы. П. Тугутт першы раз ад імя ўраду зачапіў пытаньне і аб рэформах, якія *нехта некалі мо' будзе рабіць*...

Гэта і ўсё тое *новае*, што ўнёс у палітыку ўраду п. Грабскага ідэалёг партыі „Вызваленьне". Як-жа ўсё гэта цалёка ад тых пасулаў, з якімі йшлі да нас паны Тугутты ў часе выбараў у Сойм і Сэнат, купляючы імі галасы даверчывых беларускіх сялян!

Урад аб беларускай школе.

У нядзелю, 14 сьнежня, да п. міністра Тугутта, як да тварца языковых законаў, зьвярнулася дэлегацыя Цэнтральнае Беларускае Школьнае Рады, каб беспасрэдна атрымаць ад яго адказ на пытаньне: *ці і як польскі ўрад маніцца правадзіць у жыцьці ўстаў аб роднай школе для беларусаў?*

Калі валэйшаўская банда дагэтуль яшчэ магла баламуціць лёгкаверных людзей, быццам польскі ўрад запраўды маніцца здаволіць слушныя, абапертыя на законе, дамаганьні беларускага народу мець сваю родную школу,—дык ужо цяпер *для нейкіх ілюзіяў месца ні ў кога быць ня можа.* Адказ п. Тугутта быў зусім ясны і толькі падцьвярдзіў зробленую ў Вільні-ж заяву былага міністра асьветы п. Міклашэвскага.

У гэтым школьным годзе ўрад ня зьбіраецца прыступаць да арганізацыі беларускае школы.

На будучы (1925—26) — гэтак сама нямашака ніякае гутаркі аб *беларускіх* школах: урад праяктуе адчыніць *на другую восень 45—50 школ „двуязычных"—польска-беларускіх*, дый дзеля гэтага маніцца адчыніць спэцыяльныя *курсы ў Быдгошчы ці ў Кракаве*, на якіх і падгатуе адпаведную лічбу *польскіх вучыцялёў* дзеля выкладаньня ў двуязычнай школе. Аб *беларускіх курсах* для вучыцялёў беларусаў у Вільні — таксама *нямашака гутаркі*!...

Коратка і ясна! І мы павінны быць толькі ўдзячнымі п. міністру за ягоную шчырасьць: нават і гэты „эрзац" беларускае школы ён лічыць—з увагі на настрої польскага грамадзянства—„вялікім крокам уперад"....

Камэнтарыі — лішнія. *На дзяржаўную беларускую школу ніякае надзеі ў Польшчы няма*! І мы павінны з гэтага зрабіць просты-ж і ясны вывад.

Раз школы нам не дадуць, дык *мы самі павінны яе сабе стварыць.* Надзеймася толькі на самых сябе і на свае грошы, бо ўрад на асьвету беларусаў у роднай мове з плочаных намі-ж падаткаў нічога ня дасьць. І—замест ждаць „манны з неба", — мы павінны з падвойнай энэргіяй працаваць над стварэньнем сваей уласнай, *прыватнай* беларускай школы.

Гэтымі днямі адзін вядомы ў Вільні (дый далёка па-за яе межамі!) грамадзкі дзеяч і слаўны законавед выпусьціў маленечкую кніжачку аб былых *тайных* школах у Расеі (T. Woronicz. O szkołach tajnych. Wilno, 1924 г.). Вось-жа, ня гледзячы на ўсю магутнасьць Расейскае Імпэрыі, ня гледзячы на ўсе рэпрэсіі з боку ўлады, нават польская тайная школа разьвівалася ў падпольлі ня горш, чым расейская казённая, і ўрэшце *перамагла афіцыяльную маскоўскую школу*.

Хай-жа гэты прыклад дадасьць і нам *веры ў свае сілы* і надзеі на сьветлую будучыню нашага народу. Так, ці сяк,—*беларуская школа будзе*, бо гэта — няўхільная патрэба самога народу, і *народ беларускі сам сабе яе створыць*.

ЗАКРЫЦЬЦЕ „СЯЛЯНСКАЕ ПРАЎДЫ". Пастановай віленскага акружнага суда газэта „Сялянская Праўда" прыпынена да суда за сканфіскаваны № 21. Газэта спынена на № 34.

Рэдактар А. Войцік, паклікаюы сьледчым судзьдзёй на дапрос на 16 сьнежня, як сьведка, — зарыштаваны.

Умова банкрутаў.

Большай часьці нашых чытачоў вядома ў агульных рысах дзеяльнасьць у Польшчы Барыса Савінкова, расейскага эс-эра. У працягу некалькіх гадоў ён вёў тут сваю процібальшавіцкую работу, шчыра падтрымліваны і на славах і на дзеле кіраўнічымі палітычнымі коламі Польшчы.

Разам з Філософовым, Мережковскім, а пасьля—Арцыбашавым, ён—апрача іншых способаў — вёў сваю прапаганду і на страніцах газэты „За Свободу", выдаваную за шчодрыя дары ягоных прыяцеляў.

Гэтая „чэсная кумпанія" недабіткаў маскоўскага панства, памаляваўшыся на розныя колеры, ды карыстаючыся рознымі ўстарэўшымі „дыплёмамі", ня толькі займалася тутака Масквою ці Пецярбургам, што ёсьць іх справай, але, кіраваная „прыязнаю" рукою, рабіла ў свой час спробы ўтыкаць нос і ў нашыя беларускія справы пад Польшчай, па старой прывычцы лічучы, што яны імена і прызваны дзеля прадстаўніцтва насяленьня „Крэсаў", як „русскіе"—ад „праваслаўнага насяленьня", як будучыя прадстаўнікі „трэцяе Расеі". *)

Ніці правакацыі на выбарах 1922 году ў Сойм і Сэнат з сьпіскамі „праваслаўных", „союза крестьян" на Палесьсі ў канцы канцоў вялі да варшаўскага гнязда гэных паноў, аб якіх ідзе гутарка.

Але жыцьцё зьмяло з сваей дарогі, быццам нейкую нечысьць, увесь налёт ад ветру правакацыі і крывадушнасьці, а магутная сіла нацыянальнае і сацыяльнае сьвядомасьці беларускага і ўкраінскага сялянства дайшла бліскучае перамогі.

Сам правадыр гэнае кумпаніі, Савінков, збанкрутаваўшы, паехаў у Маскву і аддаўся на ласку сваіх даўнейшых ворагаў — бальшавікоў у імя „общерусскаго дѣла", ды цяпер піша свае ўспаміны.

У Польшчы аказалася нястача патрэбнага чалавека.

Праўда, астаўшыяся кумпаны Савінкова—паны з газэты „За Свободу" — робяць сваё дзела, але гэта ўжо толькі дзеля куска хлеба, мэханічна.

Патрэбна новая фігура.

Сярод хламу маскоўскае палітычнае эміграцыі многа ёсьць гэткіх „фігур", якіх, абцершы з пылу і даўшы магчымасьць падкарміць згаладаўшае чэрава, можна йшчэ выставіць дзеля паказу і клікнуць: вось гэта той—будучы!

Ёсьцека ў Польшчы спэцыялісты да вышуківаньня і рэмантаваньня гэткіх палітычных нябожчыкаў.

Гэта слаўныя польскія пэпэсаўцы.

Прафэсыянальныя маклеры на ўсе палітычныя камбінацыі, яны выцягнулі цяпер на палітычную арэну вядомага палітычнага банкрута—расейскага эс-эра М. Чэрнова, былага старшыні няслаўнай сьмерцяй памершае ўсерасейскае канстытуанты 1917 году.

„Сколько их, куда их гонят, что так жалобно поют?"—спытае чытач словамі расейскага паэта.

Адказ просты. Ці-ж ня зьбіраюць трэскі, выкінутыя хвалямі бушуючага мора на бераг пасьля буры? Ёсьць людзі, для якіх і гэты „тавар" прыдасца.

Вось, з аднэй з гэных трэсак расейскае рэвалюцыі—Чэрновым, якога бурлівае жыцьцё, быццам нешта разьбітае, выкінула з уласнага маскоўскага віру, зрабілі цяперака пэпэсаўцы ўмову.

Зьмест гэтае ўмовы вядомы ўжо з беларускіх часопісей: галоўным пунктам яе зьяўляецца заява расейскіх эс-эраў, што яны ня будуць імкнуцца аружным шляхам да „паправы" рыжскае граніцы", якая разрэзала Беларусь...

Які-ж сэнс гэтага акту?

*) Першая Расея—царская, другая—бальшавіцкая, трэцяя—будучая—мае, быццам, належаць да паноў-недабіткаў з газэты „За Свободу".

П.П.С. была і ёсьць найбольш актыўным абаронцам польскага імпэрыялізму і экспансіі на Усход.

Гадоў 30 таму назад П.П.С., каб здабыць саюзьнікаў у барацьбе з царска-расейскім імпэрыялізмам і цэнтралізмам, прыняла праграму разьбіцьця Расеі. Аднак, адначасна — ня выраклася ягелёнскае ідэі—аб польскай вялікадзяржаўнасьці, ідэі стварэньня Польшчы з Кароны, Беларуска-Літоўскіх зямель і Украіны на падставах фэдэрацыі.

Гэта-ж акурат тое самае, што кліч польскае правіцы: вялікая Польшча—ад Чорнага да Балтыцкага мора, карацей: „od morza do morza“.

Паход Пілсудскага на Кіеў, угода з Пятлюрай імкнуліся іменна да гэтае мэты.

Аружная барацьба між Масквою і Варшавою скончылася кампрамісам: беларускія і ўкраінскія землі былі падзелены ў Рызе між Польшчай і Расеяй.

Паміма фэдэралістычных плянаў, П. П. С., якая пад той час мела ўладу (ўрад Вітос — Дашыньскі; Барліцкі і Пэрль — раднікі пілсудчыка Домбскага, старшыні польскае міравое дэлегацыі ў Рызе!), — зыйшла на грунт плянаў экспэдыцыі і яе правадыра Ст. Грабскага, падтрымаўшы ідэю поўнае інкорпорацыі („wcielenia“) беларускіх і ўкраінскіх зямель, падзеленых між Польшчай і Масквой.

Вось, значыцца, ужо ад часу Рыжскае міравое ўмовы П. П. С., фактычна, выраклася сваей „фэдэралістычнай праграмы, бо пажаданая мэта была ўжо дасягнута.

Падзеі ў Віленшчыне, утварэньне „Сярэдняе Літвы“ было апошнім „фортэлем“ гэнае ігры ў фэдэралізм дзеля чужога вока.

Цяпер — умовай з Чэрновым П. П. С. аканчальна і публічна выракаецца сваей фэдэралістычнай праграмы. Партыя польскіх сацыялістаў адкінула даўно патрапаны фігавы лісток...

Бо й якжа не?

П. П. С. умаўляецца аб рыжскай мяжы: пане Чэрнов, прызнайце яе (бо-ж вы цяпер бяз ботаў!); а мы з свайго боку таксама прызнаем вас на маскоўскім пасадзе пасьля бальшавікоў!

Чэрнов на гэта адказуе: „С одной стороны нельзя не прызнаться а с другой—нельзя не сознаться, — дык кохаймы сөн, товарищи и граждане Недзялковскі, Чаміньскі і прочая!“

І вось маем „паразуменьне“ сацыялістычных партыяў Усходу, вечны мір і дружбу Польшчы з Масквою, а ўрэшце — „что и требовалось доказать“ — матар'яльную і маральную помач. Апошнюю трэба разумець так: Чэрнов дае пэпэсам збалеўшае сэрца, затухшы дух і абвіслыя губы, а П. П. С.—нешта рэальнае, на пражыцьцё...

За гэную рэальнасьць п. Чэрнов, архімайстар „всерусскаго дела“ і прадстаўнік „всего русскаго населенія“ прыракае, абяцуе, мітынгуе і нават арганізуе маскарад „на обще-русской платформе“. Адным словам, створаны адзіны фронт проці „няведамых беларусаў“ і „мазэнінцаў“.

Што гэны маскоўскі банкрут мае гаварыць у нашых справах? Што яго сюды загнала? Каго ён прадстаўляе?

Маскоўскіх банкрутаў жыцьцё нічога не навучыла. Іх самапэўнасьць даходзе да нахальства, яны ўсё яшчэ пастараму думаюць, гавораць, умаўляюцца — за нас!

Для іх беларускае і ўкраінскае пытаньне — гэта ўсё яшчэ „мазэнінства“, „унутраная“ расэйская справа, якая ня выходзе па-за межы „обще-русскаго дела“.

Няхай! Гарбатага магіла выправіць.

Мы толькі запэўнім п. Чэрнова, што праца яго — дарэмная! З яго праектаванай акцыяй на нашых землях мы будзем змагацца, як з чароднай правакацыяй. Сунуць нос у нашы справы ды за нас умаўляцца не дазволім ніякім банкрутам!

Умова П. П. С. з Чэрновым, разьлічаная на шырокую скалю ў усходнім пытаньні, прадстаўляе адначасна **акт, скіраваны проці беларусаў і ўкраінцаў**.

Такім чынам — з дапамогай маскоўскіх банкрутаў — ідэйна збанкрутаваўшая П. П. С., ня здолеўшы праз свой шавінізм і імпэрыялізм паразумецца з намі і ўкраінцамі, хоча дайсьці ўгоды „па-над галовамі правадыроў“, як гэта модна ахрысьціў спэц-махер да „крэсавых“ спраў пэпэсавец Недзялковскі.

Гэты крок найбольш ярка раскрывае карты ў ігры П. П. С., якую гэная партыя ўвесь час вядзе, прыкрываючы істоту ігры сваім „сацыялізмам“.

Мы на тую ўмову банкрутаў адкажам коратка: мы на вашых штучках добра пазналіся, панове!

Ніякіх вашых умоваў мы ня прызнаем, а новым правакацыям дамо належны адпор.

Іл. — М.

Ніколі не зьніштажай сваей беларускай газэты! Прачытаушы, давай суседу, ці знаемаму, каб і ён пазнау прауду аб жыцьці свайго народу і даведауся, што робіцца на сьвеце!

Палітычны агляд.

У Польшчы.

Справа аўтаноміі „Крэсаў“.

У адміністрацыйнай камісіі Сойму, у зьвязку з дыскусіяй над прапазыцыяй эндэкаў — увясьці вынятковы стан на „Крэсах“ — з лявіцы была высунута справа аўтаноміі... П. Вэндзягольскі падаў праект рэзалюцыі, заклікаючай урад да апрацаваньня аўтаномнага статуту для „Крэсаў“.

Былы вызваленец, цяпер віцэ-прэм., п. Тугутт, у сваей віленскай прамове заявіў, што і ён таксама „ў ідэі“ — прыхільнік аўтаноміі, але што яна цяпер яшчэ „перадчасная“... А пакуль што—пакуль на яе прыдзе час, — урад будзе рабіць „zespolenie“...

„Rada Kresowa“.

Як пішуць польскія газэты, старшынёй „Крэсавай Рады“ ўжо назначаны б. віленскі дэлегат ураду, п. Роман. Далейшы склад Рады пакуль-што не ўстаноўлены, але ўжо пэўна, што ў яе ўвойдзе б. выбарны камісар „Сярэдняе Літвы“, а цяпер сьвянцянскі староста, п. Забежоўскі.

„Вынятковыя паўнамоцтвы“ для ўраду.

Урад Грабскага быццам ня мае прасіць у Сойму далейшага працягу вынятковых паўнамоцтваў, якія канчаюцца на Новы Год. Але — замест гэтых паўнамоцтваў—пераважна ў галіне фінансава-эканамічнай, урад будзе дамагацца ад Сойму паўнамоцтваў у галіне „адміністрацыйнай“—дзеля ўпарадкаваньня „stanu bezpieczeństwa“ — на „Крэсах“...

Паўнамоцтваў для п. прэм. Грабскага больш ня трэба. Але трэба паўнамоцтваў ужо для п. віцэ-прэм'ера Тугутта...

„Вынятковыя паўнамоцтвы“ для ўраду „ў галіне адміністрацыйнай“—гэта-ж і ёсьць „вынятковы стан“, якога ўрад, а перад усім в.-пр. Тугутт, так ня хоча...

Прэм. Грабскі ставіць пытаньне аб даверыі да ўраду.

У соймавай бюджэтнай камісіі 16.XII ўзьняўся востры канфлікт паміж Соймам і Урадам. Камісія 17 галасамі проці 9 прыняла прапазіцыю — даваць ураду, пакуль ён не прадставіць запраўднага падрабязнага бюджэту,—крэдыты толькі памесячна, а не на 3 месяцы зразу, як прадбачана ў тым „прэлімінарным бюджэце“, які падаў Сойму ўрад.

Прадстаўнік ураду быццам згадзіўся на гэта, але сьледам за гэтым на паседжаньне зьявіўся павядомлены прэм. Грабскі, які рашуча заявіў, што гэткую пастанову камісіі будзе лічыць выражэньнем недаверыя да ўраду, ды што ў найгоршым выпадку згадзіўся-б толькі на 2-месячныя „провізорыі“.

Дзеля таго, што на тым-жа паседжаньні ня можна пераглядаць ужо прынятых пастановаў, камісія адлажыла разгляд канфлікту на наступнае паседжаньне.

Кандыдат на міністра асьветы.

Кандыдатам на міністра асьветы называюць былага прэм'ера праф. Поніковскага.

Выдача паслоў.

Соймавая камісія пастанавіла запрапанаваць Сойму выдаць суду паслоў: камуніста Ланьцуцкага і украінцаў: Васыньчука Паўла, Сярг. Казіцкага, Чучмая і кс. Ількова.

Баранавіцкі працэс.

15.XII распачаўся ў Слоніме ў даразным судзе працэс учасьнікаў нападу на цягнік пад Баранавічамі. З усей арганізацыі (90 душ) былі арыштаваны па падазрэньні—32, з якіх толькі 20, як быццам, пазнаныя пасажырамі, станулі цяпер перад судом.

Арышт „камсамольцаў“.

9.XI ў Варшаве арыштаваны яшчэ 40 „камсамольцаў“.

Польшча і ССРР

„Сегодня“ піша, што па трэбаваньню ўраду ССРР польскі ўрад выдаў радавай уладзе нейкую Зайцаву, жонку сэкратара ўкраінскага камітэту, арыштаваную за шпіёнства ў пятлюраўскай украінскай місіі ў Варшаве.

Шпіёнская арганізацыя.

Польскія газэты паведамляюць, што ў Варшаве паліцыя выкрыла шырока разгалiненую шпіёнскую арганізацыю камуністаў, якая ахоплівала цэлы рад мест па-за Варшавай.

Сьмяротныя прысуды.

9.XII ў Роўным даразны суд засудзіў на расстрэл бандыта Усьцімчука, забіўшага 2 купцоў-жыдоў.

У Глыбокім таго-ж дня даразны суд засудзіў на расстрэл Цурокава за забойства і аграбленьне Сьвердлова ў часе пераходу яго праз граніцу.

Напады і арышты.

10.XII ў в. Ходы, Стаўпецк. пав., паліцыя арыштавала 2 узброеных бандытаў, якія прымалі ўчасьце ў адным з нападаў у Наваградзкім ваяводзтве.

У той-жа дзень у в. Любень, Стаўпецк. пав., арыштавана яшчэ адна „асоба пад падазрэньнем у ўчасьці ў апошніх бандыцкіх нападах на Крэсах“ (!—колькі такіх „асобаў“ у нашай многапакутнай Беларусі!).

9.XII ўначы 3 узброеныя бандыты напалі на вучыцельку народнай школы, якая ехала са станцыі Каміньскай, Лодзкага ваяв. Бандыты двойчы стрэлілі ў вучыцельку і абрабавалі на 40 злотых. Пасьля, загадаўшы ёй стаяць на шляху да раніцы, ўцяклі

Здаецца, такога выпадку на „Крэсах“ яшчэ ня было... („Rob.“).

Выбары ў Клюбе „Вызваленьне“.

Віцэ-старшынямі Клюбу „Вызваленьне“ выбраны, пасьля доўгіх спрэчак, п. п. Путэк, Валерон, Домбскі і Косьцялковскі.

Угодкі прэм'ерства п. Грабскага.

19.XII скончыцца год, як п. Грабскі зрабіўся прэм'ерам у Польшчы. П. Прэм'ер мае прыняць у гэты дзень журналістаў, якім прадставіць „dorobek“ працы ўраду за гэты год.

Заграніцай.

Справа „гарантыяў“ у Радзе Лігі Народаў.

Газэты пішуць, што ў Рыме ў часе сэсіі Рады Лігі адбываліся в. важныя перагаворы паміж правадырамі эўрапэйскіх дзяржаў — аб стварэньні дагавору аб узаемнай гарантыі паміж 3—4 дзяржавамі, які-б замяніў няўдаўшыся ў Жэневе „пратакол“. Быццам Рада Лігі прызнала, што Польшча, Румынія, Чэхаславакія і інш. дзяржавы Эўропы вымагаюць зусім выразных і больш рэальных гарантыяў...

Страх пераможцаў перад Нямеччынай і ССРР расьце...

Урадавы крызіс у Эстоніі.

У сувязі з камуністычным замахам у Эстоніі, выбухнуў урадовы крызіс. Сучасны габінэт падаўся ў адстаўку, жадаючы стварыць для ўраду шырэйшую парляманцкую базу (апору). Цяпер у Рэвелі адбываюцца паседжаньні прадстаўнікоў усіх клюбаў—пад старшынствам Тэнісона — у справе гэтай урадавай коаліцыі, да якой імкнуцца ўсе партыі.

Ці саюз проці ССРР?

Эстонскі ўрад афіцыяльна пярэчыць вестцы, пушчанай з Гэльсінгфорсу (Фінляндыя), быццам Эстонія, Літва і Латвія маюць зрабіць Саюз дзеля мілітарнага аб'яднаньня проці небясьпекі з боку С. С. Р. Р.

Прамова Каменева і Рыкава.

Каменев заявіў у праграмнай прамове, што ўрад ССРР будзе і далей вясьці палітыку міру, не паддаючыся ніякай правакацыі і не адхіляючыся ад галоўнага шляху ў той ці іншы блудны тупік, які падсоўваюць яму яго ворагі... ССРР будзе спакойна і ўверана разьвіваць свае сілы, ведаючы, што ніхто на яго замахнуцца не пасьмее.

На сходзе студэнтаў закаўкаскага зямлячаства старшыня рады нар. каміс., Рыков, заявіў у сваей прамове, паміж іншым, што ўвесь сьвет бачыць і прызнае заслугі радавай улады ў дзеле вызваленьня паняволеных народаў Усходу. Палітыка Радаў здабыла сабе найшчырэйшыя сымпатыі сотняў мільёнаў гэтых паняволеных народаў, і гэтыя сымпатыі з кожным месяцам растуць... Але, разам з тым, растуць і гнеў і антыпатыі гэтых народаў да імпэрыялістаў, расьце і нездаволеньне ўрадаў імпэрыялістычных дзяржаў радавай уладай.

Як піша „Сегодня“, Каменев у сваей прамове востра крытыкаваў новы англійскі габінэт, закідаючы кансэрватарам фальшы і бесчалавечнасьць...

Англійская буржуазія, казаў ён, баючыся новага чыну радавай дзяржавы, робіць усе высілкі, каб задушыць усялякую самастойнасьць усходніх гаспадарстваў, блізкіх да ССРР. Але гэткая палітыка кансэрватараў толькі ўзмоцніць глыбокае спачуцьцё да радавай улады і да комінтэрну з боку ўсіх народаў, якія бачаць у маскоўскіх бальшавікох адзіных правадыроў свайго адраджэньня.

Падача пасольскіх грамат.

12/XII Пасол ССРР Красін аддаў на ўрачыстай аўдыэнцыі (прыеме) прэзыдэнту Франц. Рэспублікі свае пасольскія паўнамоцтвы. Пры гэтым радавы пасол сказаў прамову, у якой заявіў, што яго мэтай будзе ўзмацненьне шчырапрыязных адносінаў паміж народамі Расеі і Францыі. Прэзыдэнт Думэрг адказаў прамовай, у якой перад усім

падчыркнуў, што падставай гэтых добрых адносінаў павінен быць перад усім прынцып узаемнага няўмешываньня у ўнутраныя справы абодвух Краёў... Бо-толькі ў атмосфэры ўзаемнай пашаны і даверыя могуць разьвівацца карысныя эканамічныя адносіны паміж абодвума краямі.

Студэнцкія разрухі ў Белградзе.

Рэакцыйны ўрад Пашыча хутка выклікаў пратэст з боку найшляхотнейшай часткі грамадзянства—яго перадавой моладзі. — Пратэст харвацкага студэнцтва перакінуўся і да Белграду, дзе таксама адбыліся запраўдныя баталіі паміж студэнтамі і коаліцыяй. Студэнты зачынілі барыкадамі ўсе ўваходы да ўнівэрсытэту, ня пускаючы ў яго паліцыю... Але пасьля запраўднага штурму паліцыя прарвалася скрозь барыкады і арыштавала рад студэнтаў... Калі апошніх вялі ў турму, насяленьне места вяло сябе пагражаючa, адносна паліцыі,—было нават некалькі спробаў адбіць арыштаваных.

Рэвалюцыя ў Албаніі.

У Албаніі сяляне, нездаволеныя крыўднай зямельнай рэформай, паднялі паўстаньне, якое ператварылася ў запраўдную рэвалюцыю.

Арышт б. імпэратрыцы ў Вэнгрыі.

У Будапэшце (сталіца Вэнгрыі) арыштавана б. імпэратрыца Зіта, якая прыехала з фальшывым пашпартам у Вэнгрыю, каб стануць на чале манархічнага замаху на істнуючы лад.

Яе сын, Оттон, меўся аб'явіць сябе каралём. У манархічную змову ўблутаны вядомыя палітычныя дзеячы.

У Нямеччыне.

У „Сегодня“ пішуць з Бэрліну, быццам в. магчыма, што прапазіцыя стварыць новы ўрад будзе зроблена Марксу.

Нямецкія газэты пішуць, што значны ўплыў на стварэньне новага ўраду будуць мець выбары ў прускі сойм, дзе сац.-дэмакраты страцілі 24 мандаты, а нацыяналісты здабылі аж 33 новыя...

Газэта „Zeit“ падлічыла, што „буржуазны блёк“ можа мець большасьць 271 галасоў (?), тады апазіцыя складалася-бы з камуністаў, нацыянал-сацыялістаў“ (фашыстаў-гітлераўцаў) у ліку 59 паслоў — і сац.-дэмакратаў — у ліку 153 паслоў; — усяго 212 галасоў.

Рашаючай групай былі-б тады людоўцы штрэзэмана (які і высоўваецца на прэм'ера пры гэтай камбінацыі). Дэмакраты, якія ігралі гэтую рашаючую роль у папярэднім парляманце, ды тую-ж роль пры „вялікай коаліцыі“ цэнтра-леву, пры цэнтра-правай большасьці зусім страцяць сваё значэньне.

Цэнтральны статыстычны ўрад, які падлічаў рэзультаты выбараў, сцьвярдзіў, што агульную лічбу паслоў трэба павялічыць яшчэ на 4 дэпутатаў. Трэба ведаць, што, паводле нямецкага выбарнага закону, кожныя 60,000 галасоў даюць 1 пасла, дык лічба іх наперад не прадбачана, як сталая, але залежыць аб лічбы галасаваўшых грамадзян.

Гэткім чынам, усяго паслоў у Рэйхстагу будзе **493**.

Цікава, што 13 кандыдацкіх сьпіскаў прапалі зусім, не атрымаўшы аніводнага мандату, хаця яны ўсе разам сабралі 600,000 галасоў, г. зн. — аж на 10 паслоў!...

Англійскія і амэрыканскія газэты вельмі задаволены вынікам выбараў у Нямеччыне, якія перад усім сцьвярдзілі, што нямецкі народ, у галоўнай сваей масе, адрокся ад манархіі, перамог рэакцыйны мілітарызм у краі і імкнецца да палітыкі міра.

Гэйніш ізноў прэзыдэнтам Аўстрыі.

9.XII аўстрыяцкае Саюзнае Сабраньне — галасамі хрысьціянскай дэмакратыі і „ўсе немцаў“ — выбрала ізноў прэзыдэнтам Аўстрыйскай Рэспублікі Міхала Гэйніша.

Новы Прэзыдэнт Швайцаркай Рэспублікі.

Прэзыдэнтам Швайцарскай Рэспублікі выбраны сябра Саюзнай Рады п. Муса.

Мусоліні гатовы адыйсьці.

Мусоліні заявіў у Сойме ў сваёй прамове, што, калі-б кароль сказаў яму — прэм'еру, што ён „можа адыйсьці“, дык ён, ня думаючы нават, зараз-бы ўступіў мейсца другому...

Дагэтуль, здаецца, фашысты і сам Мусоліні пагражалі выгнаць караля, калі-б ён ня прызнаў фашыстаў...

Расстрэл суданскіх афіцэраў.

Англійцы прадаўжаюць тэрор у Судане. Толькі што расстраляны яшчэ тры ягіпецкія афіцэры ў Судане.

Чацьвёрты засуджаны на 15 гадоў турмы.

Англійскія работнікі аб палітыцы свайго ўраду.

Пасольскі клюб партыі Працы падаў у парлямант прапазіцыю — выразіць жаль з прычыны палітыкі ўраду ў ягіпецкім і расейскім пытаньнях.

366 галасамі проці 132 прапазіцыя гэная адкінута.

Трывога Японіі.

Амэрыканскі флёт вясной мае зрабіць вялікія маневры ля берагоў Аўстраліі—у Спакойным Акіяне—разам з аўстралійскім флётам.

Гэта вестка выклікала вялікую трывогу ў Японіі, якая бачыць у гэтых маневрах падгатоўку Амэрыкі да хуткай вайны з Японіяй, — у якой Аўстралія мае быць саюзьніцай Амэрыкі...

„Разбраеньне“ і „пацыфікацыя“ сьвету растуць...

Замест сьвяточных візытаў.

Замест сьвяточных візытаў—гэнага старога перажытку, складайце ахвяры на Беларускі Прытулак у Вільні!

Імёны асобаў, якія зложаць з гэтай мэтай ахвяру кіраўніцтву Прытулку, (Вострабрамская № 9), будуць надрукаваны ўбеларускіх часопісах.

Аб чым пішуць.

Голас з-за кардону.

Спрэчка аб Вільню і зьвязаная з ёй справа беларуска-літоўскіх адносінаў адбілася гулкім эхам у Менску. Да нас дайшла выразка стацьці на гэту тэму з газэты „Сав. Беларусь“ з 28 лістапада, дзе, паміж іншым, чытаем:

> У сваёй спрэчцы і польскія і літоўскія буржуазныя палітыкі забываюцца аб факце, які можа аказацца (і напэўна акажацца) рашаючым у вызначэньні далейшай долі Вільні і Віленшчыны. Тая **Віленшчына**, якая цяпер знаходзіцца ў межах Польшчы — **край беларускі**, заселены беларускімі працоўнымі масамі, з невялікаю дамешкаю іншых нацыянальнасьцяў (жыдоў, палякаў, літоўцаў і інш.). Гэтага факту не сфальшуе ніякая белапанская статыстыка, з якою цяпер у Эўропе паважныя навуковыя ўстановы ня лічацца (прыклад: нядаўная ангельская карта). Пакуль беларускія сялянскія масы заставаліся пасыўнымі, датуль польская і літоўская буржуазія маглі весьці сябе так, як-бы гэтых масаў зусім ня было. Цяпер-жа становішча зьмяняецца.
>
> Дзякуючы цэламу раду прычынаў, заходня-беларускае сялянства абуджаецца да палітычнае актыўнасьці.

Гэта, па думцы „Сав. Бел.“, і ёсьць той новы факт, з якім прыходзіцца вельмі паважна лічыцца. Газэта прыводзе адрывак з перадавіцы „Przegl. Wil.“ — органу віленскіх краёўцаў, што стаяць на груньце дзяржаўнага аб'яднаньня Беларусі і Літвы, у якім гаварылася:

> „Калі яшчэ год назад галоўнае месца ў нашых балячках займала польска-літоўская спрэчка, у сучасны момант на першы плян высоўваецца беларускае пытаньне. Яго напружаньне вельмі ўзмаглося і пад уплывам бязумоўных нацыянальных дасягненьняў у межах Савецкае Беларусі імкненьні і трэбаваньні таксама і па гэты бок граніцы няпрыметна ад абароны перайшлі да наступу. Нязьмерна характэрным у гэтым сэнсе ёсьць усё болей часты ўспамін у беларускім друку аб Вільні, як аб сталіцы Заходняй Беларусі.
>
> Дла нас гэта не зьяўляецца неспадзеўкаю. Яшчэ ў лютым г. г. ў артыкуле „Беларусь і Літва“ мы прадбачылі разьвіцьцё палітычнага становішча якраз у гэтым кірунку. Мы пісалі тады: „Калі дагэтуль пазіцыя Літвы была значна мацнейшаю..., дык у далейшым хто ведае, ці пункт цяжкасьці не перасунецца да Менску. Дзеля свае адзіноты Літва асуджана на пасыўнасьць і чаканьне, тагды як Беларусь, сфэдэраваная з усею і вялізнаю Расеяй, у меру разьвіцьця нацыянальнае і палітычнае сьвядомасьці народных масаў, будзе зьяўляецца дынамічнаю сілаю і ў адпаведны момант папрабуе захапіць ініцыятыву.
>
> Успомненая зьмена сілаў настала нават раней, чым мы тагды думалі. Няўдача Літвы ў Віленскай справе перад Лігаю Народаў перасоўвае літоўскае імкненьне да свае даўнейшае сталіцы з рэальнае палітыкі да рамантычных лятуценьняў, тады як плянавая і вытрыманая палітыка Саветаў дае беларускім імкненьням выразныя формы, якія ўсё болей і болей высьняюцца.
>
> Справа Вільні заблутваецца“.

Ад сябе „Сав. Бел.“ дадае:

> Газэтка перасьцерагае Варшаву і Коўну ад недаацэнкі гэтага стыхійнага размаху народных масаў, вынік якога цяжка нават прадбачыць. Наглядаючы абвастрэньне спрэчак і спрэчнасьцяў, газэтка заяўляе, што на ажыцьцяўленьне думкі аб адзінстве цяпер разьлічаць цяжка, што яно можа быць і адбудзецца, але на зусім новых падставах.
>
> Ну, а мы ў гэтым пэўны.

Мы свой пагляд на гэтую справу ўжо высказалі.

А — віч.

Хроніка.

У Таварыстве Беларускае Школы. У нядзелю, 14 сьнежня, адбыўся паўторны агульны сход сяброў Т-ва Беларускае Школы, важны пры ўсякай лічбе прысутных. Сабралося звыш 80 сяброў з правам рашаючага голасу.

Пасьля справаздачы Бел. Цантр. Школьнае Рады аб дзейнасьці яе за мінулы год, а так-жа пасьля дакладу Надзорчае Рады, старшыня Б.Ц.Ш.Р., кс. Станкевіч, расказаў сабраным аб выніках гутаркі дэлегацыі Т-ва з п. міністрам Тугуттам.

Пасьля аднагалоснага прыняцьця дакладаў Б.Ц.Ш. Рады і Надзорчае Рады сход прыступіў да выбару новага складу кіраўнічых органаў Т-ва. Выбары далі гэткія вынікі.

У Бел. Цантр. Шк. Раду ўвайшлі: 1) кс. Станкевіч, 2) Тарашкевіч, 3) Рак-Міхайлоўскі, 4) Астроўскі, 5) Рагуля, 6) Мятла, 7) Манкевіч, 8) Кепэль, 9) Кароль, 10) Шнаркевіч, 11) Пяткевіч, 12) Савіцкі. Кандыдаты: 1) Сакалова, 2) Галяк, 3) Гаўрылік, 4) Сіняўскі.

У Надзорчую Раду выбраны: 1) Язэп Гапановіч, 2) Ф. Ярэміч, 3) Ў. Самойла, 4) Э. Будзька, 5) Лукашэвіч, 6) Касатая, 7) Шандроха, 8) Марцінчык, 9) Трэпка, 10) Зянюк. Кандыдаты: 1) Стэцкевіч, 2) Крук.

У панядзелак, 15 сьнежня, адбыліся арганізацыйныя сходы нававыбраных установаў дзеля выбару прэзыдыумаў.

У прэзыдыум Бел. Цантр. Шк. Рады выбраны: старшыня—дэпутат Тарашкевіч; віцэ-старшыні; дэп. кс. Станкевіч і дэп. Рак-Міхайлоўскі; скарбнік—Манкевіч, заступнікам яго—Астроўскі; сэкратар—Шнаркевіч, заступнік яго—Савіцкі.

Старшынёй Надзорчае Рады выбраны А. Трэпка, сэкратаром—Лукашэвіч. Выбары другіх сяброў прэзыдыуму адложаны.

Дэлегацыя Цэнтр. Бел. Школьнае Рады, зложаная з грам. кс. А. Станкевіча, дырэктара гімназіі Р. Астроўскага і грам. Я. Гапановіча з учасьцем пасла Ярэміча даведалася ў нядзелю, 14 сьнежня, да п. міністра Тугутта і вяла з ім гутарку ў школьных справах. Вынікі гутаркі дужа сумныя: урад наагул стаіць на тым становішчы, што трэба адкрываць школы двуязычныя (польска-беларуская) і на гэтым маніцца абаперці ўсю сваю школьную палітыку. Дзеля гэтага будзе створана ў Быдгошчы ці ў Кракаве вучыцельская сэмінарыя на 60 асоб, якая будзе падгатаўляць вучыцялёў для польска-беларускіх школ. Гэткіх школ урад праектуе адчыніць на будучую восень 45—50. Аб чыста беларускіх школах урад ня думае....

Адведзіны п. Тугутта ў беларускіх установах. Міністар Тугутт у панядзелак паміж 12 і 1 гадз. прыяжджаў у Віленскую Беларускую Гімназію. З міністрам быў віленскі куратар Гонсёровскі і вышэйшыя ўрадоўцы кураторыуму. П. Тугутта спаткалі дырэктар гімназіі, п. Астроўскі, і старшыня бацькаўскага камітэту, п. Кепэль, кароткімі прамовамі, адзначаючы цяжкае палажэньне гімназіі, байкатаванай польскім урадам, і ўсе крыўды, дазнаваныя вучнямі гімназіі з прычыны пазбаўленьня апошняе права публічнасьці. П. Тугутт радзіў быць цярплівымі і ждаць паляпшэньня...

Міністар быў прысутны на лекцыях у II (на прыродзе) і VIII клясе (на польскай мове).

Гожа адзначыць, што куратар пры гэтай нагодзе першы раз быў у Беларускай Гімназіі...

З гімназіі госьці пайшлі ў музэй ім. Ів. Луцкевіча ў Базыльянскіх мурох, дзе іх сустрэлі і давалі аб'ясьненьні старшыня і сябры ўраду Беларускага Навуковага Т-ва.

„Амністыя“ Косьцевічу. Адзін „из стаславных“ супрацоўнікаў Аляксюка, цяперашні „дзеяч“ валэйшаўскае шулерні, Макар Косьцевіч, уславіўся ня толькі сваім палітычным бандытызмам, але і чыста крымінальнымі „дзеяньнямі“: ён украў даверанныя яму грошы „Kasy Chorych“, у якой служыў, за што і быў арыштаваны і выдалены са службы.

Справа гэтая сталася вядомай ня толькі ў-ва ўсей Заходняй Беларусі, але і ў Варшаве; у міністэрстве і ў Сэнаце. Справа ў тым, што Косьцевіч, дзякуючы „несьвядомасьці“ радашкоўскае школьнае рады, быў прыняты ею на становішча вучыцеля беларускае гімназіі ў Радашкавічах. Вось-жа, калі яго кандыдатура была прадстаўлена дзеля зацьверджаньня віленскаму куратару, п. Гонсёровскаму, той з абурэньнем адкінуў яе, бо-ж немагчыма аддаваць узгадаваньне моладзі ў рукі звычайнага крыміналіста.

Але гэтым справа ня скончылася. Адзін „сэрдабольны“ сэнатар у сьвятой наіўнасьці зьвярнуўся да міністра асьветы з просьбай даць Косьцевічу „амністыю“ і пазволіць яму быць вучыцелем гімназіі. П. міністар, аднак, на падставе інфармацыі п. Гонсёровскага, рашуча адкінуў просьбу. Мала таго: аб ёй голасна пачалі гаварыць у-ва ўсім Сэнаце, і эндэкі выкарысталі гэты неаглядны паступак сэнатара, каб паганіць беларускае вучыцельства наагул.

Прайшоў год. Відаць, пагляды ўраду на маральнасьць за гэты час так рэзка зьмяніліся, што цяпер—пасьля „работы“ ў Валэйшы — Косьцевічу далі „амністыю“ бяз ніякае просьбы. Яго ня толькі прыняў міністар Тугут, як прадстаўніка валэйшаўскага „грамадзянства“, але і запрасіў на банкет, на якім Косьцевіч сядзеў за адным сталом з найвышэйшымі польскімі ўрадоўцамі, а ў тым ліку і... з выгнаўшым яго са службы, як зладзея, панам куратарам Гонсёровскім!...

Як відаць, „амністыя“ Косьцевічу дадзена

поўная! Ці не найважнейшае гэта здарэньне з бытнасьці ў Вільні п. Тугутта?

Прадстаўнікі шулерні ў „Крэсавай Радзе“. Валэйшаўскі „Грам. Голас“ піша, што п. Тугутт заявіў п. п. Косьцевічу і Шышкову, што запросіць ад „валэйшаўскае“ партыі прадстаўніка ў „Крэсавую Раду“, бо... запрошаны ім пасол Ярэміч адмовіўся.

Мы зьвярнуліся ў гэтай справе да самога п. Ярэміча, каторы заявіў нам, што яго, запраўды, запрасіў п. Тугут у „Крэсавую Раду“, як прадстаўніка беларусаў, але ён яшчэ свайго адказу ня даў. Значыць, або „Грамадзкі Голас“ піша няпраўду, або—няпраўду сказаў п. Тугутт...

Новы замах на цягнік. 12/XII між станцыямі Горадня-Друскенікі сторож заўважыў, што на чыгункавым масьце адкручана вельмі важная гайка, адсутнасьць якой магла выклікаць катастрофу.

Арышт шпіёнскай арганізацыі ў Вільні. „Dz. Wil.“ паведамляе, што ў Вільні паліцыя выкрыла групу тарговых агентаў жыдоў, якая быццам мела мэтай шпіёнства на карысьць бальшавікоў. Цэнтрам арганізацыі быў Гданск. Арыштаваны 5 агентаў з кіраўніком „Закордоту“ з Менску. Паміж іншымі, арыштаваны вядомы купец Рубін з Радашкавіч.

Карэспандэнцыі.

Ізноў Староста з апэрэткі.

(З Сьвянцяншчыны).

Хвароба „палахлівасьці“ нашай крэсавай адміністрацыі перад абы-як узброенымі людзьмі, якая ня так даўно захапіла на Палесьсі „левага“ ваяводу Довнаровіча, як чуем, пачынае эпідэмічна пашырацца і захопліваць нат‘ цэнтрава-правых адміністратараў меншага калібру, і то даволі далёка рэзыдуючых ад мейсца першага яе паяўленьня. Як адносяцца жыхары краю да гэткіх „заразьліва“ хворых асоб, урад добра ведае і стараецца ў час прыбраць іх, каб не мазолілі людзкога вока і дарэшты не падрывалі аўтарытэту ўлады на „Крэсах“. Дзеля гэтага Довнаровічу далі адстаўку.

Пан прэм‘ер Грабскі, каб выказаць пагляды ўраду ў гэткіх справах, у сваім экспозэ ў Сойме сказаў што: „Stosunki na Kresach są tego rodzaju, że gotowości do osobistego natychmiastowego odpierania siłą siły napastniczej, musimy wymagać od wszystkich czynników władzy, a tembardziej od osób, stojących na czele administracji“, а тым самым ад нас, як лёяльных грамадзян Рэчыпаспалітай, патрэбаваў выказываньня гэткіх, можа часамі і ўкрытых, выпадкаў „занядужаньня“.

Выпадкі гэткага „занядужаньня“ на „палахлівасьць“ здарыўся з нашым Старостай Сьвянцянскага павету, Забежовскім. Гэты адміністратар, які так „адважна“ кідае абвіненьні ў „палітычнай неблаганадзёжнасьці“ дзеля абяздоленьня і „ўнічтаженьня“ сваіх праціўнікаў — супрацаўнікоў за дамаганьне рэвізіі рахункаў сойміку, што, магчыма зачапіла-бы і асабіста пана Старосту, які „адважна“ праводзіць усялякімі падходамі зацьверджаньне сваіх, не заўсягды справядлівых і абапертых на законе „внёскаў“ ды распараджэньняў у тутэйшым сойміку, — неяк не на сьмех занядужаў на „палахлівасьць“. Было гэта ў канцы верасьня чы пачатку кастрычніка, а гадзіне неяк 6 увечары, пасярод мястэчка ў Сьвянцянах. Калі „адважны“ пан Староста, як кажуць, „пятухом“ ішоў па вуліцы, накінуліся на яго нейкія людзі ў вайсковых вопратках і давай яго, па сьвянцянску кажучы, „морд-даваць“. Публіка, якая прахадзіла міма, чуючы нядобрае, пачала хавацца ў блізкія вароты і ўкрадкам спаглядаць, як гэныя бандыты тукмосяць, аж лязг і стон ідзе, сьвянцянскага „дыплямату“. Бедны пан Забежовскі, замест сьмела стануць у сваей абароне, бо хіба-ж быў узброены хоць рэвальвэрам, пачаў запраўды вельмі непаважна пішчэць, мэльдуючыся бандытам: „я староста, староста павету!“ Як-бы падзадораныя гэтым бандыты, як мага, трапалі сваю ахвяру, і толькі як у справу ўмяшаўся нейкі жыдок, што кінуўся ратаваць Старосту і рашуча наставіўся да бандытаў, дык яны толькі тады пусьцілі Старосту, а п. Забежовскій папёр да хаты.

Крыху пачакаўшы, бандыты скрыліся, а пан Староста, відаць, на сьмерць перапалоханы, замест зараз вызначыць пагоню, даволі доўга „апраўляўся“, і толькі каля 8 гадзіны зьявіліся першыя вайсковыя і паліцэйскія патрулі на мейсцы здарэньня. Зразумелая рэч, нікога з бандытаў не знайшлі. Кажуць, пан Стараста, сьпярша вінаваціў вайсковых. Улада вайсковая мястэчка, хочучы дайсьці праўды і знайсьці вінавайцу ды ўкараць яго, сабрала ўсіх вайсковых у двор казарм і прасіла пана Забежовскага пафатыгавацца прыехаць ды апазнаць злачынцаў. Чакалі, чакалі, але той не зьявіўся. Абурыліся вайсковыя. Справа набрала гуку, і цяпер у павеце ходзіць гутарка, як „мордавалі“ сьвянцянскага старасту бандыты.

Заўсягды спрытныя памоцнікі Старасты: п. Монтвіл і „дактарок“ не заказалі гэтым разам моднае „дзенкчыннае набажэнства“ за „цудоўнае ацаленьне“ і ні ў адным № „Życia Święciańskiego“ мяйсцовай газэце „свой“ біяграф пан „Jarwicz“ не апісаў нападу на пана Забежовскага, а прэсе замяйсцовай аб гэтым трудна даведацца, бо большая частка сьведкаў здарэньня маўчыць, запужаная магчымасьцяй „адміністрацыйных узысканьняў“. Аднак, відаць, сумна на душы за апошнія часы нашаму адміністратару, бо разумее, што выпадак „хваробы“ некалі адкрыецца, а забегі „лекара“ ўраду вядомы. Праўда і ён ня лыком шыты, будзе яшчэ і як выкручывацца.

Будзе, пэўне, праз розных „дактаркоў“ пісацца і „вырсьненьне“, у каторым усё зьвядзецца да інтрыгі „врогіх элемэнтаў“; „салодка“ папросяць членаў Сойміку напісаць „аправержэньне“ і просьбу аб „астаўленьні“ п. Забежовскага ў павеце, як вельмі патрэбнага. Але нам здаецца, што гэта яму паможа, як нябожчыку кадзідла, бо шмат хто, а перад усім вайсковыя, ня пойдуць ні на які кампраміс.

„Рэдактар“.

„Макам“ селі.

(В. Астроукі, Гарадзейскае гм., Нясьвіжскага пав.).

Ужо два гады, як нашы дзеткі „вучацца“ ў польскай школе, а карысьці з гэнае навукі няма, бо вучні не разумеюць вучыцялёў. Напрыклад, адзін вучань казаў: „Якая ж гэта школа? Мая мама мяне вучыла, што на небе ёсьць Бог, а ў школе кажуць, што не — бук, а я добра ведаю, што бук гэта — дрэва“.

Даведаўшыся, што ў гэтым годзе можна адчыняць беларускія школы, мы сабралі сход, сабралі з носа па грошу, паслалі ў мястэчка Мір, напісалі паперы і панясьлі да солтыса, Уладыслава Шукайлы на подпіс; але той, лічачы сябе паляком, падпісаць адмовіўся.

Тагды пайшлі да вучыцеля, п. Старовскага, шукаць рады; дык ён як усхопіцца, як закрычыць, што й прыступу няма; бандытамі называе, вастрогам страшыць і ў канцы пацешыў, кажучы, што, „як вушэй сваіх, так ня ўбачыце сваӗй школы хамскай, беларускай“.

Дык мы і селі макам. **Тутэйшы.**

Школы няма, а штраф ёсьць!

(З Гарадзенскага павету).

У нумары 19 „Сялянскай Праўды“ была надрукавана карэспандэнцыя аб тым, што з 2-га верасьня ў вёсцы Матылі быўшая польска-беларуская школа ня істнуе, бо пад школу ніхто з сялян ня даў хаты. Цяпер школы няма, а штраф ёсьць. 5-га сьнежня г. г. атрымалі сяляне вёскі Матылі, лікам 33, „гасьцінец“ ад пана інспэктара па трыццаць злотых, а адзін 60 зл., за тое, што не запісаны дзеці ў школу. Ці не на паперы пана інспэктара істнуе Матыльская школа ад 2-га верасьня 1924 года? Мусі хто нат‘ і пэнсію вучыцельскую атрымлівае за вучэньне Матыльскіх дзяцей? Ці можа далучылі Матыльскіх дзетак да Бэрштанскай школы, каторая ад Матылёў знаходзіцца за дваццаць шэсьць вёрст? Пра гэта сялянам невядома, а штраф ад 18.XI 1924 года ёсьць: паведамілі!

Рэшчык.

За зайца — у морду і пратакол.

(З Пружанскага пав.).

Маладыя Леашоўскія хлапцы вязьлі ванну ў м. Блудзень. Дарога праходзіць праз зямлю абшарніка Мартынцава, таго самага, каторы жджэць паншчыны. І вось здарылося, што сабака аднаго з хлапцоў злавіў зайца на панскім полі.

Даведаўшыся пра гэта, абшарнік Мартынец пасьпяшыў паведаміць Блудзенскі пастарунак аб здарэньні.

Здаўшы ванну, хлопцы варочаліся дамоў, а „вінаваты“, даведаўшыся, што яго шукаюць, паганяў каня, як толькі мог.

Паліцыянт сеў на другую падводу і пачалася гонка, у каторай пераможцай аказаўся паліцыянт.

Злавіўшы дрыжэўшага ад страху хлапца, пачаў біць: біў, пакуль ня збрыдла гэтая работа, а кончыўшы „работу“, павёў на пастарунак, дзе спісалі пратакол, — ведама толькі не аб біцьці!

Асавецкі.

Не пашэньціла і войту!

(З Пружанскага пав.).

Пан Ковальскі, войт Селецкае гм., за апошнія два гады страшна разбагацеў, выстраіў: хату, клуню, хлеў, толькі не накрыў, — як здарылася няшчасьце.

Адна жанчына з вёскі Чарнічнага атрымлівала ад брата з Амэрыкі даляры, каторыя былі адрасаваны на яе прозьвішча па першаму мужу.

Калі яна панясла павестку на подпіс, дык войт падняў галаву (—спаў, палажыўшы галаву на стол!), узяў павестку, прачытаў і сказаў, што не падпіша, і колькі ні прасіла жанчына, войт адказваў маўчанкай.

Шукаючы рады, пайшла да жыда, у каторага хаце месьціцца пошта, і просіць пахлапатаць; дык той згадзіўся і праз дзьве мінуты павестка была падпісана, толькі за падпісаньне войт узяў 8 даляраў і выдаў расьпіску, што даляры атрымаў.

Жанчына аказалася ня дурная: падала скаргу ў Староства, і на другі дзень пана войта вызвалі ў староства — на „badanie“. На яго няшчасьце, з ім ужо другі такі выпадак, і можна спадзявацца, што суха не пяройдзе! **А—кі.**

Культурнае жыцьцё у Радавай Беларусі.

Інбелкульт.

Мы тут, здалёк, цешымся, што ў Менску істнуе Інстытут Беларускае Культуры — паважная навуковая ўстанова, якая нават цяпер мае быць ператворана ў Беларускую Акадэмію Навук. Аднак, ня ўсё тамака гэтак гладка, як нам выдаецца: ці то „партыйніцтва“, якое аддае кіраўніцтва нават часта навуковымі ўстановамі, выключна, партыйным камуністам, ці якая іншая тутака ўбілася хвароба, — адно толькі выходзе, што ўстанова, якая павінна быць цэнтрам ўсяго беларускага культурнага жыцьця, прадстаўляецца як-быццам мёртвай, пазбаўленай жывога духа!

Вось, што піша аб Інбелкульце д-р І. Цьвікевіч у „Сав. Бел.“:

„Сярод беларусаў трымаецца да гэтага часу страшна шкодны для іх-жа самых погляд, што беларуская культурная справа—гэта рэч надзвычайна далікатная, да таго далікатная, што аб хібах яе можна гаварыць шэптам і то ў вельмі далікатным тоне.

„Было-б гэта зразумела, калі-б беларуская культура была нечым спарахнелым ад уплыву тысячагодзьдзяў, накшталт нейкай эгіпецкай мумії, да якой нельга дакрануцца, бо рассыпецца ў пыл. А то-ж, сама моладасьць, сама сьвежасьць! Такая жыцьцёвая і рухавая, што чуваць, як гарачая кроў шуміць у моцных жылах. Спрабуем жа хоць час ад часу голасна гаварыць аб тым, што блага ў нас.

„Інбелкульт. Гэта ня склеп, дзе схованы струхнеўшыя муміі, а жывая інстытуцыя з жывымі людзьмі. Усё-ж такі, нават нам, сябром гэтай інстытуцыі, часамі здаецца, быццам мы замураваны, адарваны, адрэзаны ад жыцьця.

„Чаму? ў чым справа?!

„Ну, няхай раней! Ня было грошай для арганізацыі працы, ня было памяшчэньня для сходаў, сама ўстанова была нейкім нявыразным дадаткам да Наркамасьветы і г. д. Цяпер Інбелкульт—дзяржаўная ўстанова, грошы асыгнованы, зроблены крокі, каб даць вялізны будынак у тры паверхі і ўсё іншае, а арганізацыйнай, дзейнай з кожным днём (падкрэсьліваем: днём!, бо ў даны момант кожны дзень ёсьць цэлы пэрыяд) пашыраючайся і паглыбляючайся працы яшчэ няма.

„Ня будзем па пунктах разглядаць, проста бяром на выбар адзін прыклад.

„У Менску дый па ўсіх буйнейшых гарадох Беларусі расьце справа выданьня газэт, часопісяў і кніг. Амаль што кожная ўстанова мае сваю часопісь або свае друкаваныя справаздачы. На гэтых днях нам давялося атрымаць беларускую газэту сшытак, надрукованую ў працягу аднэй ночы. Дзе-б вы думалі: у Калінкавічах! Выпусьцілі яе трое маладнякоўцаў, паехаўшых туды з Менску толькі на тры дні.

„Інбелкульт ня можа надрукаваць ніводнае часопісі, і ня чутно, каб справа гэта ішла напарад. Ці-ж гэта ня сорам?! А матар‘ялаў для часопісі Інбелкульт мае ня мала.

„Недзе смоўж паўзе...

„Час ужо арганізаваць Інбелкульт на новых падставах. Час ужо стварыць актыўнае арганізацыйнае ядро гэтай установы, бо набліжаецца 25 год, які можа прайсьці для Інбелкульту гэтак жа мала прадукцыйна, як і мінулы“.

Сумны гэта абраз і паказвае відавочна, што йшчэ многа трэба папрацаваць беларусам там, на Усходзе, каб назоў „Беларускае Сацыялістычнае Радавае Рэспублікі“ запоўніць запраўды беларускім зьместам....

Усячына.

Міністар і буквары.

Як ужо ведама нашым чытачом, міністар асьветы, п. Міклашэвскі, які „схаваў пад сукно“ закон аб беларускіх школах, пасьля двойчы высказанага яму Соймам недаверыя пакінуў, урэшце, сваё зусім неадпаведнае для яго асобы становішча. У сувязі з гэтым, адзін з нашых падпішчыкаў прыслаў нам гэты вершык, успамінаючы прыезд п. Міклашэвскага ў Вільню і заяву яго, што сёлета ўрад беларускіх школ адкрываць ня будзе.

Сабраўшы пісакаў з польскае прэсы,
Пан Міклашэвкі ўзяўся за Крэсы.
Вось, на пытаньне з іх аднаго:
„Мо‘ не хватае для школаў чаго?“—
У пана міністра знайшоўся адказ:
„Злотаў на іх не хватае у нас“!..
—А дзе-ж тыя злоты, што з нас за падаткі
Бяруць кожны дзень то з зямлі, то ад хаткі?
Аб гэтым міністар слаўца не сказаў:
Бач, аб падатках нічога ня знаў!..
Пасьля гаварыў, што падручнікаў мала.
Хіба ўжо ў Польшчы паперы ня стала?
Хіба ня знойдуцца ўжо друкары,
Што ўмелі-б для нас друкаваць буквары?
Няхай не бядуець: такія знайдуцца,
Што за друкарскую працу вазьмуцца
І надрукуюць яны буквароў
На ўсю Беларусь—для дзяцей жыхароў!

Падгародні.

Як быць вечна маладым?

Амэрыканскі прафэсар Карльсон дайшоў да перакана765ньня, што, каб людзі не старэлі, яны павінны ад часу да часу вызначыць сабе двохтыднёвы пост. Ад такое галадоўкі арганізм чалавека амаладжаецца, а пасьля яе цела хутка варочаецца да нармальнае вагі, набірае элястычнасьці і энэргіі.

Выдавец Антон Пракопеня.

Друкарня Н. Левін і Сын, Вільня, Нямецкая 22.